ЗАЦВЯРДЖАЮ
Загадчык сектара культуры
Іўеўскага райвыканкама
С.В.Кішкель

ІНСТРУКЦЫЯ аб парадку
арганізацыі і правядзення
раённага конкурсу
выканаўцаў размоўнага жанру

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення раённага конкурсу выканаўцаў размоўнага жанру (далей - Конкурс).
2. Мэтамі і задачамі Конкурсу з'яўляюцца: стымуляванне творчай актыўнасці і павышэнне ўзроўню сцэнічнай культуры мастацкіх калектываў і індывідуальных выканаўцаў размоўнага жанру; накапленне і сістэматызацыя здабыткаў вуснай народнай творчасці; узбагачэнне духоўнага свету насельніцтва сродкамі фальклорнага і сучаснага эстраднага мастацтва (паэтычная і празаічная формы); павышэнне прафесійнага ўзроўню і распаўсюджванне творчага вопыту.
3. Арганізатарамі Конкурсу з'яуляюцца: аддзел метадычнай работы ДУК "Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу".
4. Конкурс праводзіцца 1 раз у 2 гады.
Пройдзе ў два этапы:
**1 этап** - раённы Конкурс пройдзе **30 сакавіка 2025г.у 13.00 гадзін** у філіяле аг.Трабы ДУК "Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу".
**2 этап** - абласны Конкурс адбудзецца **31 кастрычніка 2025г.** у ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".
5. У Конкурсе прымаюць удзел выканаўцы размоўнага жанру (творчы калектыў, асобны выканаўца)незалежна ад ведамаснай прыналежнасці і без абмежавання ўзросту, **2** заяўкі ад кожнага філіяла ДУК "Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу".
6. Канкурсанты рыхтуюць да выканання празаічныя альбо паэтычныя творы розных жанраў мастацкага слова агульнай працягласцю да **5 хвілін** у выглядзе паўнавартаснага канцэртнага нумару размоўнага жанру.
7. Пераможцы Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі ў наступных намінацыях:
народная проза (легенды, паданні, апавяданні, казкі);
проза, інсцэніроўкі празаічнага твора;